Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

29 ЛІСТАПАДА 2018 г. ЧАЦВЕР № 230 (28846)

У ВЁСКУ — ПА ШЧАСЦЕ І КЛОПАТЫ

НЯНЯ Ў ДАПАМОГУ: КАЛІ І КАМУ

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір СІЗОЎ, намеснік старшыні канцэрна «Белнафтахім»:

«У нас у якасці стратэгіі абрана паэтапнае павышэнне цэн на паліва. Мы адсочваем змяненне сітуацыі на рынку, тое, як гэта ўплывае на эканоміку нафтаперапрацоўкі, адсочваем сітуацыю са змяненнем курса. Таксама на нас аказвае ўплыў падатковы складнік. Зыходзячы з гэтых фактараў, менавіта паэтапна змяняецца і кошт на нафтапрадукты».

КОРАТКА

- Прафсаюзныя прававыя прыёмы 29 лістапада праходзяць у сельскіх населеных пунктах і аграгарадках.
- **Першы ў Віцебскай вобласці эксперыментальны дом з электрычным ацяпленнем пабудаваны ў Лёзне.**
- Вонкавыя работы па аднаўленні паўночнай вежы і сцен Гальшанскага замка плануецца завяршыць да канца года.

- **Узброеныя Сілы Беларусі плануюць прыняць на ўзбраенне да канца года чатыры зенітна-ракетныя комплексы «Тор-М2».**
- Забег Санта-Клаусаў упершыню пройдзе ў Мінску 15 снежня.
- **Рэгістратары ўдакладнілі адрасы ўсіх будынкаў для падрыхтоўкі базы перапісу насельніцтва Беларусі, які пройдзе ў 2019 годзе.**

Мастацтва ў шакаладзе

Фота БелТА.

У віцяблянкі Наталлі ЦАПУК незвычайнае хобі: з дапамогай шакаладу яна стварае жывапісныя палотны. Нядаўна ў музеі-сядзібе І. Рэпіна «Здраўнёва» прайшла яе персанальная выстаўка, на якой было прадстаўлена больш за 30 шакаладных карцін.

Вандроўка патрыёта

Чым прыцягальны Глуск?

Карэспандэнт «Звязды» пра турысцкія выпрабаванні, мясцовыя рэліквіі і «слёзы» святой Валянціны Мінскай

Нашы турыстычныя вандроўкі па Магілёўскай вобласці працягваюцца. І няхай скептычна ўсміхаюцца аматары далёкіх падарожжаў, якія аддаюць перавагу шырока разрэкламаваным маршрутам. Маўляў, ну што там можна ўбачыць у гэтай беларускай глыбінцы. Дзесьці яны маюць рацыю, сапраўды, часцей даводзіцца задавольвацца прыгожымі краявідамі і легендамі. Але ж яны таксама наша спадчына. Мы працягваем вывучаць айчынны турыстычны патэнцыял і ацэньваць яго даступнасць. Вось, напрыклад, у Глуск з Магілёва ніколі не абернешся за адзін дзень. Чамусьці для адзінага рэйса выбраны не самы зручны час — 15.30. У Глуск аўтобус прыбывае вечарам. Каму гэта цікава? Дакладна не турысту. Але мы не шукаем лёгкіх шляхоў. А сёмай гадзіне раніцы едзем у маршрутцы на Бабруйск, а адтуль у 9.20 накіроўваемся ў Глуск. А палове на адзінаццатую мы ўжо на месцы.

СТАР. 13

Бюст двойчы Героя Савецкага Саюза С. Ф. Шутава.

Слова ў навуцы

ЦУДАДЗЕЙНЫ «СТВОЛ» ДРЭВА ЖЫЦЦЯ

Клетачныя тэхналогіі могуць здзейсніць рэвалюцыю ў лячэнні самых цяжкіх захворванняў

Калі свет упершыню пачуў аб паспяховых медыцынскіх эксперыментах з прымяненнем ствалавых клетак, гэта стала не проста сенсацыяй — цудам, які можна параўнаць хіба што з вынаходствам элексіру маладосці. Асабліва ўражлівыя натуры на поўным сур'ёзе пачалі казаць аб надыходзе эры бессмяротнага чалавека. Бо цяпер, з захапленнем сцвярджалі яны, у лабараторных умовах можна вырасціць любы орган homo sapiens: ад воласа да пяткі. Аднак хутка высветлілася, што гэта толькі мары. Хоць і не безнадзейныя. Біялагічная навука сапраўды зрабіла апошнім часам такі істотны крок наперад, што дае нам усё больш падстаў для самых аптымістычных спадзяванняў. Выклікае гонар той факт, што Беларусь знаходзіцца сярод краін, якім удалося асвоіць найскладанейшыя тэхналогіі лячэння людзей на аснове ўласцівасцяў клеткі арганізма. Аб гэтым размова з дырэктарам Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі Нацыянальнай акадэміі навук Андрэем ГАНЧАРОВЫМ.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!

Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!